


# І ЗНОЎКУ ПРА КАХАННЕ

**Выдавецтва "Мастацкая літаратура" (Мінск) працягвае серыю кніг пад знакам сімвалічнага трыядзінства – "Вера. Надзея. Любоў". Чарговы зборнік айчыннай прозы атрымаў назву "Скажы, што кахаю…" У кнігу ўключаны творы аўтараў з розных куткоў Беларусі. У тым ліку і апавяданні нашых калег па пісьменніцкай арганізацыі, гродзенскіх пісьменніц Людмілы Кебіч і Ліны Багданавай.**

Зноў і зноў выдавецтва "Мастацкая літаратура" збірае ў рамках свайго доўгатэрміновага, шматтомнага праекта розныя меркаванні, адчуванні, бачанні самага высокага пачуцця, на якое здольная чалавечая прырода. І ў чарговы раз тэма кахання прагучала на розныя галасы, як заўсёды, патэтычна і ўзнёсла, як заўсёды, з ноткамі драматызму, праявіўшы яркую палітру індывідуальных творчых стыляў. На імкненне да пачуцця і невядомасць канчатковага выніку яго чакання намякае шматкроп'е ў канцы загалоўка кнігі. Апускаючыся ў поўныя інтрыг і эмоцый, узятыя са свядомасці аўтараў, быццам са штодзённасці сюжэты, чытач амаль што аказваецца ўцягнутым у адзін з іх.

У кнігу сучаснай прозы Беларусі "Скажы, што кахаю…" ўключаны апавяданне Людмілы Кебіч "Дзень першага снега" і два апавяданні Ліны Багданавай "И всё-таки капуста!" і "Да здравствует лишний вес!"

***

"Зборнік прозы "Скажы, што кахаю…" – новая кніга серыі "Вера. Надзея. Любоў". У яго ўвайшлі творы пісьменнікаў розных пакаленняў, чые імёны даўно вядомыя чытачам і тых, хто яшчэ не мае сваіх першых кніжак. Галоўная тэма зборніка – каханне, пачуццё, што хвалюе сэрца, высакародзіць душу і робіць жыццё радасным ці прыносіць трывогі і пакуты", – гаворыцца ў анатацыі да кнігі .

У кнізе 454 старонкі. Пераплёт цвёрды. Выдавецкі кошт: 34 руб. 20 кап. Укладальнік *Віктар Шніп*. Пытайцеся ў бібліятэках і кнігарнях рэспублікі.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**